**Глыбачанская сярэдняя школа**

# *Прэзентацыя тыдня перспектыў па матывацыі самаразвіцця падлеткаў*

## *"Ад кампетэнтнаснага настаўніка да кампетэнтнаснага вучня”*

**2025/ 2026 навучальны год**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Намеснік дырэктара па АД
_____________ Казлова Г.В.
08.11.2025

# ПАЛАЖЭННЕ

аб прэзентацыі тыдня перспектыў па матывацыі самаразвіцця падлеткаў
"Ад кампетэнтнаснага настаўніка да кампетэнтнаснага вучня"

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Прэзентацыя тыдня перспектыў па матывацыі самаразвіцця падлеткаў праводзіцца ў Дзяржаўнай установе адукацыі "Глыбачанская сярэдняя школа імя Б.І.Юркіна Ушацкага раёна" у рамках плана самакантролю.

## 2. МЭТА:

- стварыць ўмовы для рэалізацыі адукацыйных працэсаў, якія забяспечваюць павышэнне якасці навучання шляхам матывацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў;
-прыцягнуць увагу калектыву да сучасных тэхналогій, якія спрыяюць павышэнню матывацыі;
-садзейнічаць падтрымцы творча працуючых педагогаў і павышэнні прафесійнага майстэрства педагогаў;
-здзяйсняць дзейнасць па выяўленні і распаўсюджанні інавацыйнага педагагічнага вопыту;

## 3. ЗАДАЧЫ:

-усведамленне настаўнікамі педагагічнай праблемы фарміравання матывацыі вучэнні як найважнейшай, што вызначае выніковасць адукацыйнай дзейнасці
-фарміраванне у педагогаў ўстаноўкі на выкарыстанне метадаў і прыёмаў павышэння вучэбнай матывацыі школьнікаў
-укараненне і распаўсюджанне сучасных адукацыйных методык і тэхналогій, якія дазваляюць павысіць матывацыю школьнікаў да навучання.

## 4. УДЗЕЛЬНІКІ тыдня перспектыў:

педагогі ўстановы адукацыі 1 – 11 класаў.

## 5. ЧАС ПРАВЯДЗЕННЯ тыдня перспектыў:

Прэзентацыя тыдня перспектыў пачынаецца10 лістапада і працягваецца па 15 лістапада бягучага навучальнага года

## 6.Этапы арганізацыі матывацыі на ўроку:

**1 этап.** Матывацыя пачатку працы.

Праводзіцца ў пачатку ўрока і займае па часе 3-5 хвілін.

**Яго мэта**: паказаць вучням неабходнасць вывучэння дадзенай тэмы, перавагі дадзенага матэрыялу, падняць цікавасць і прыцягнуць увагу дзяцей, г. зн. уключыць іх у актыўную пазнавальную дзейнасць.

**2 этап**. Матывацыя ходу выканання працы.

**Яго мэта**: падмацаваць і ўзмацніць зыходную матывацыю, выклікаць цікавасць да спосабаў рашэння пастаўленых задач і іх супастаўленне (пазнавальныя матывы), да розных спосабаў супрацоўніцтва з іншым чалавекам (сацыяльныя матывы). Неабходна, каб на гэтым этапе выбар спосабу матывацыі ўзгадняўся з рашэннем агульнавучэбных і прадметных мэтаў і задач урока.

**3 этап.** Матывацыя завяршэння працы.

**Яго мэта**: выхад кожнага вучня з дзейнасці са станоўчым вопытам, а таксама фарміраванне ў канцы ўрока станоўчай ўстаноўкі на далейшае вучэнне, г. зн. станоўчая матывацыя перспектывы. Галоўным прынцыпам тут з'яўляецца ўзмацненне ацэначнай дзейнасці саміх навучэнцаў у спалучэнні з дыферэнцыраванай адзнакай самога настаўніка, прычым яна можа быць як станоўчай, так і адмоўнай. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць увагу на тое, каб паўстала і ўмацавалася ўстойлівае жаданне да далейшага вывучэння прадмета.

## 7. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ прэзентацыі тыдня перспектыў

По выніках прэзентацыі тыдня перспектыў вызначаюцца творча працуючыя педагогі. Намеснік дырэктара ўстановы адукацыі забяспечвае афармленне і распаўсюджанне метадычных напрацовак педагогаў, асвячэнне вынікаў конкурса ў сродках масавай інфармацыі і на сайце ўстановы адукацыі.

# План правядзення адкрытых урокаў у ходзе прэзентацыі тыдня перспектыў (10.11-20.11.2025):

**11.11.2025** – фізіка, 11 клас,  Сяліцкая І.А.

**11.11.2025** – хімія, 7 клас,  Зенюк А.М.

**12.11.2025** – матэматыка, 7 клас,   Каліноўская Л.В.

**20.11.2025 –**  руская мова, 3 клас , Уліцкая Н.М.

**17.11.2025** – руская літаратура, 10 клас, Літвін К.Д.

**18.11.2025**- беларуская мова, 9 клас, Герцык А.С.

# Інфармацыя
# аб правядзенні прэзентацыі тыдня перспектыў па матывацыі самаразвіцця падлеткаў

***З 10 па 15 лістапада 2025 года*** ва ўстанове адукацыі прайшла прэзентацыя тыдня перспектыў па матывацыі самаразвіцця падлеткаў , у якой педагогі паказалі не толькі высокі ўзровень падрыхтоўкі, але і разнастайныя формы правядзення заняткаў. У ходзе тыдня наведаны 6 урокаў: ***урок - даследаванне*** (Зенюк А.М., 7 клас, урок па прадмеце “Хімія” па тэме “Валентнасць”), ***урок з элементамі гульні*** (Уліцкая Н.М., 3 клас, ***урок - прэзентацыя*** рускай мовы па тэме “Нулевое окончание”), ***урок вывучэння новага матэрыялу*** ( Каліноўская Л.В., 7 клас, урок матэматыкі па тэме “Множанне мнагачленаў”, Сяліцкая І.А., 11 клас, урок фізікі па тэме “Пераменны ток.Трансфарматар” ), урок-падарожжа (Герцык А.С., 9 клас, урок беларускай мовы па тэме “Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай часткай”) , камбінаваны ўрок (Літвін К.Д., 10 клас, урок рускай літаратуры па тэме “Образ Л.Огудаловой в пьесе Н.Островскго “Бесприданница”).

Сяліцкая І.А., Герцык А.С., Літвін К.Д., Уліцкая Н.М. прапанавалі ***ўрокі з прымяненнем камп’ютарных тэхналогій.***

Урокі былі пабудаваны метадычна граматна, з выкарыстаннем элементаў гульнёвых тэхналогій, элементаў тэхналогіі праблемнага навучання і поўнага засваення матэрыялу. Спалучэнне нагляднага, праблемнага, гульнёвага і дзейнаснага метадаў навучання, а таксама індывідуальнай, франтальнай і групавой формаў работы, прыёмаў апеляцыі да жыццёвага вопыту дзяцей, праблемныя пытанні, выказванні навукоўцаў садзейнічалі павышэнню матывацыі самаразвіцця падлеткаў. Педагогі стваралі сітуацыі поспеху для кожнага вучня, вучылі думаць, рабіць высновы, падтрымлівалі актыўнасць і працаздольнасць вучняў на працягу ўсяго ўрока. Таксама павелічэнню матывацыі, пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў спрыяла чаргаванне відаў дзейнасці. Для падтрымання ўвагі навучэнцаў практычна на ўсіх этапах урока выкарыстоўвалі змену дзейнасці, фізкультхвілінкі і практыкаванні на ўвагу. Настаўнікі назіралі за кожным вучнем, выяўлялі цяжкасці і памылкі, акцэнтуючы на іх увагу, каб папярэдзіць іх паўтор іншымі дзецьмі. У класах панавала атмасфера супрацоўніцтва, даверу, узаемнай павагі.

На ўроках выкарыстоўвалася дастатковая колькасць нагляднага матэрыялу, дэманстраваліся змястоўныя, насычаныя вучэбным матэрыялам прэзентацыі.

Маладыя настаўнікі наведалі прэзентацыю тыдня перспектыў, вызначылі цікавыя формы і метады работы на ўроках у вопытных калег-педагогаў, якія можна ўзяць для пераймання.

**Каліноўская Л.В. вядзе ўрок матэматыкі ў 7 класе па тэме “Множанне мнагачленаў”**





**На ўроку фізікі ў 11 класе па тэме**

**“Пераменны ток.Трансфарматар”, настаўнік Сяліцкая І.А.**







Урок рускай літаратуры ў 10 класе па тэме “Образ Л.Огудаловой в пьесе Н.Островскго “Бесприданница”, настаўнік Літвін К.Д.








Беларуская мова 9 клас. Урок-падарожжа па тэме “Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай часткай», настаўнік Герцык А.С





***Урок – прэзентацыя,*** 3 клас**,** урок рускай мовы па тэме “Нулевое окончание”, настаўнік Уліцкая Н.М.




20 ноября
Классная работа

